**УДК 82.09 (476)**

# Д'ЯБАЛ ЯК САЦЫЯЛЬНЫ ПЕРСАНАЖ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ *XIX* - ПАЧ. XX СТСТ.

***канд. філал. навук, дац. С.І. ДАНІЛЕНКА***
***(Магілёўскі дзяржаўны універсітэт імя А. Куляшова)***

*Аналізуецца месца і роля д 'ябла як персаніфікацыі сусветнага зла ў сістэме сацыяльных зносін беларускага грамадства. Інфернальная вобразнасць, архегНыпічная для іудзея-хрысціянскай культурнай традыцыі, выступала для беларускіх пісьменнікаў XIX - пач. XX стст. зыходным пунктам белетрыстычнага асэнсавання і адлюстравання рэчаіснасці: Тым самым вызначаецца адна з найбольш знакавых рыс спецыфікі сацыяльнай міфатворчасці ў літаратуры гэтйга перыяду.*

У беларускай літаратуры XIX - пач. XX стст. даволі пашыранай з'яўляецца мастацкая дэманізацыя сацыяльнага жыцця. Таму з'явы, якія адвяргаліся пісьМеннікамі непазбежна набывалі д'ябальскую «афарбоўку». Адна з галоўных спакус, якую д'ябал абяцае чалавеку, гэта магчымасць як мага *«лепш уладкавацца на свеце».* Гэтай роллю падацеля матэрыяльнага дабрабыту перадвызначаецца надзвычай высокі сацыяльны статус д'ябла як персанажа мастацкай літаратуры. У творах беларускіх пісьменнікаў ён заўсёды *«паніч», «шляхціц»* (Я. Баршчэўскі «Радзімы знак на вуснах») [2, с. 156], *«панічык»* (Ф. Багушэвіч «Хцівец і скарб на святога Яна» (1887) [1, с. 41], *«паніч»* (Я. Купала «З кірмашу») [9, с. 90] і нават *«кароль»* (У. Караткевіч «Легенда аб бедным д'ябле...») [8, с. 100]. Адпаведным чынам д'ябал апранаецца ў «панскія» строі, бо які ж «змусіцель» роду людскога мог атрымацца з чорта ў сярмязе? Таму найбольш пашыраным яго адзеннем з'яўляецца арыстакратычны *«фрак»* (Я. Чачот «Свіцязь») [12, с. 142] ці, больш іранічна, - *«храк»* (К. Вераніцын «Два д'яблы») [3, с. 355].

Разам з тым часам не д'ябал пераапранаецца ў «панскае» адзенне, а самі прадстаўнікі сацыяльнай эліты дэманізуюцца, набываючы класічныя д'ябальскія рысы, што найбольш характэрна для аповесці У. Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха» (1958). Так, *«вобраз д'ябла-паляўнічага за душамі быў папулярнай метафарай сярод сярэднявечных энцыклапедыстаў, а зялёны колер быў традыцыйным колерам паляўнічага адзення. Іншай паралеллю з 'яўляецца Зялёны Чалавек, звычайнае кельцкае і германскае ўвасабленне тоднасці»* [10, с. 82]. У гэтым кантэксце сваё гранічна дакладнае вытлумачэнне атрымліваюць вобразы шляхціца-душагуба Грыня Дубатоўка, правадыра *«дзікага палявання»,* што наводзіць жах на навакольных сялян, і нашчадка старажытнага роду Берман-Гацэвічаў, Малога Чалавека Балотных Ялін: *«істоты»* ў *«зялёным старадаўнім убранні»* з *«галавой, доўгай, выцягнутай назад, як боб»* [7, с. 172].

Найбольш яскравае ўвасабленне мае тое зло, якое нясе селяніну д'ябал-пан у хаўрусе з панамі сапраўднымі, знаходзіць на старонках цыкла апавяданняў Я. Баршчэўскага «Шляхціц Завальня, або Беларусь у фантастычных апавяданнях». Адным з галоўных герояў гэтага твора з'яўляецца чалавек прывілеяванага стану - шляхціц Завальня, у сядзібе якога і расказваюцца жахлівыя апавяданні пра тое, як *«у нашых краях праз чары і праз шкодных людзей растадзіліся злыя духі»,* якім *«людская злосць <...> - найлепшая паша»* («Рыбак Родзька») [2, с. 145]. У поўнай адпаведнасці з ідэалагічнымі і эстэтычнымі традыцыямі літаратуры неасарматызму ў дадзеным выпадку сам *«шляхецкі дом уяўляецца светлай адасобленай прасторай, да якой не маюць доступу «чорныя духі». Яго жыхароў характарызуе высакародная прастата і шчырасць, унутраны спакой»* [14, с. 31]. Сядзіба Завальні на беразе Нешчарды - асклепак ідылічнага Залатога веку Рэчы Паспалітай, забытая выспа, ахіленая з усіх бакоў вірлівымі і небяспечнымі водамі новых часоў, варожых і незразумелых патрыярхальным насельнікам шляхецкай Аркадыі. На гэтай выспе пануе старасвецкая шляхецкая цнатлівасць і шчырая пабожнасць, якая не ўласцівая «новаму» панству эпохі расійскага прыгону, што прадало сваю душу д'яблу. Нават з іх чэляддзю, *«дваровымі»,* небяспечна звязвацца пабожнаму чалавеку, бо яны падобна да сваіх паноў таксама «з *рознымі чараўнікамі»* маюць *«фамільярнае сяброўства»* (Ян Баршчэўскі «Пра чарнакніжніка і пра цмока, што вылупіўся з яйка, знесенага пеўнем») [2, с. 97].

Галоўнымі праявамі таго страчанага Залатога веку, з'яўляецца амаль райскі дабрабыт і амаль поўная адсутнасць паноў як сацыяльнага класу: *«У нашых ваколіцах старыя памятаюць шчаслівейшае жыццё, калі было шмат начцівых, старанных і працавітых людзей; у той час, кажуць, кожны гаспадар меў у дастатку зямлі, і радзіла зямля заўсёды добра, хапала хлеба і корму жывёле. У азёрах і рэчках было столькі рыбы, што моладзь, бавячыся ля вады з першай-лепшаю прыладаю, лавіла столькі рыбы, што ледзь магла забраць з сабою дадому. Паноў было не шмат, ды і тыя пабожныя, і жылі яны дзесьці далёказаДзвіною»* [2, с. 145 - 146]. Але з новымі часамі з'явіліся новыя паны, нават не паны -

*«паўпанкі»,* кожны з якіх, *«маючы некалькі ўбогіх хацін, дорага плаціць за карэты і багатыя строі, вымудраецца, каб здабыць грошы: прадае жывёлу і апошні хлеб, даводзіць бедны люд да таго, што той мусіць кожную вясну карміцца горкім бабоўнікам».* Менавіта з-за гэтых новых *«паўпанкаў» «/' ў нас развялося злых духаў столькі, што колькі разоў з 'яўляліся яны перад мноствам народу, чаго раней у нас ніколі не бывала»* («Рыбак Родзька») [2, с. 146]. Гэтыя духі івадавочныя, бессаромныя і беспакараныя. Тым самым спраўдзіліся *«прадчуванні простых людзей,* якія пераканаліся, што галоўнае прызначэнне пякельных *«шкоднікаў, каб яны крыўдзілі бедных сялян».* І панаванне д'яблаў на Беларусі знаходзіць свае адметныя вясковыя метафары, што ствараюць падабенства сялянскага Апакаліпсісу. Яны ўласцівыя светапогляду земляроба, які жыве працай рук сваіх у глыбокай і спакойнай суладнасці з прыродай. Але сама прырода паўстае вайной супраць селяніна: *«Тады было шмат заломаў у жыце, з'явіліся порсткія зяркі, што забіць іх было немагчыма, і яны па аборах стрыглі авечак, а мядзведзі, нападаючы ўсюды на пчальнікі, збіралі мёд. <...> паўсюль снавалі зграі ваўкалакаў, што страх было выйсці ў поле»* («Белая сарока») [2, с. 212].

Такім чынам, нястачамі і галечай абарочваецца для сялян вясёлае і бесклапотнае жыццё паноў, што дзеля золата і раскошы прадалі свае душы д'яблу. Яны пераступілі мяжу чалавечай маралі і таму перасталі бачыць сапраўднае агіднае аблічча злога духа. Таму далёка *«неўсе даюць веры»* звесткам пра прыход страшных часоў - *«толькі просты люд моліцца, просячы Бога, каб збавіў ад <...> нячысціка»* («Чараўнік ад прыроды і кот Варгін») [2, с. 272], і тым часам як *«паны» «ўхвалялі <...> думкі»* д'ябла, толькі *«лёкаі і сяляне праклінаталі яго і з пагардаю называлі чорным госцем»* («Стогадовы стары і чорны госць») [2, с. 259]. Менавіта за гэта *«паны адкажуць перад Богам, бо не маюць веры»* («Рыбак Родзька») [2, с. 152]. Аднак і ў душы селяніна, галоднага і забітага, д'ябап мае пільную патрэбу. Жыццё сялян настолькі гаротнае, што нават чорт, пусціўшы *«дзьве <...> сьлязы»,* можа шчыра паспачуваць няшчаснай долі мужыка-гарапашца, як гэта адбываецца ў вершы К. Сваяка (1890 - 1926) «Бабе і чорт з дарогі саступае», што быў надрукаваны ў яго віленскім зборніку «Мая ліра» (1924): *«Аж ня вытрымаў чарціна, // Жаль яго навет хапіў: // «Бедняку кожны наруга - // Ніхто па ім сьлёз ня ліў...» <...> «Бедны-бедны людрабочы, IIХоць тыў пеклаубяжыі..»* [11, с. 104].

V дадзеным выпадку верш К. Сваяка выдатна ілюструе тэндэнцыю, якая выявілася ўжо ў канцы XIX ст. у творчасці Ф. Багушэвіча і атрымала сваё далейшае развіццё ў пачатку XX ст., распачаўшы своеасаблівую палеміку з ранейшай маральнай пазіцыяй польска-беларускіх, «сармацкіх» рамантыкаў, што сягала сваімі каранямі ў артадаксальную хрысціянскую этыку. Гэтая пазіцыя вызначалася крайнім этычным рыгарызмам: нішто - ні сацыяльнае паходжанне, ні выключныя жыццёвыя абставіны - не можа служыць падставай для любога пагаднення са злом. Таму Божы суд у творах з аднолькавай няўхільнай суровасцю ставіцца як да багатага грэшніка, так і да беднага. Атрымлівае пакаранне за змову з д'яблам *«хлопец з кішэняй пустою»,* які шчыра кахаў багатую купецкую дачку ў баладзе Я. Чачота «Свіцязь» (1819) [12, с. 141], Войцах у падобнай жа сітуацыі з балады Т. Зана (1796 - 1855) «Свіцязь-возера» (1820) , бедны рыцар Твардоўскі з яго ж балады «Твардоўскі» (1819) [15]. Галоўным лейтматывам падобнага роду стаўлення з'яўляюцца якраз радкі са згаданай балады Я. Чачота: *«...Адкінь ты адразу жаданне, якое Н З бядою, злачынствам сябруе Н Не, лепей памерці ад голаду, смагі НІ шчасця не ведаць адвеку, II Чым подласць зрабіць хоць каму без развагі...»* [12, с. 156]. Падобнай думкі прытрымліваўся і Я. Баршчэўскі, які без ваганняў карае «нялюдскай» смерцю селяніна Карпу ці вясковага чараўніка Парамона, згадкай пра якога засталася толькі *«магіла <■■■> у полі без крыжа»* («Пра чарнакніжніка і пра цмока, што вылупіўся з яйка, знесенага пеўнем») [2, с. 110].

Ф. Багушэвіч, у сваю чаргу, імкнецца апраўдаць сваіх грэшнікаў у сярмязе, што найбольш яскрава выявілася ў вершы «Не ўсім адна смерць» і ў «Баладзе», змешчаных у «Смыку беларускім» (1890 - 1894). Так, у вершы «Не ўсім адна смерць» перад чытачом паўстае лёс пана і селяніна. Пан, *«багаты», «нехарошы»,* што *«жыў у раскошы вялікай»,* што *«не мог палічыць сваіх грошы»,* якіх «у *склепе, як бульбы»,* пан, якога сяляне *«баялісь, як Бога»* [1, с. 83], урэшце захварэў і мусіць паміраць. Адначасова з ім памірае і селянін: «*...I калекі быў ён, і хварэў; IIХата ў дзюрах, як лапаць ды з лык. II Сам па два дні нічога не еў».* Аднак, падобна да пана, праведным жыццём і селянін ніколі не вызначаўся, за што яго *«людцы праклінаюць»,* а «ў *пекле <...> чэрці» «і хаму, і пану прызналі кут»: «Калісьці быў, кажуць, надта ліхі Н / першы падліза у пана; Н Былі на душы усякі грахі, III пекла даўно абяцана»* [1, с. 84]. Таму *«чорт старшы»* выпраўляе за душамі грэшнікаў разам з *«цётанькай-смерцю» «чорта (трохі храмога)».* Тым часам, пакуль смерць змагалася, са шматлікімі дактарамі за жыццё пана, што *«уміраць ані мысле сабе»* [1, с. 84], і *«ўсё грошы пад бруха грабе»,* а чорт чакаў яго душу, мужык, ціха і *«лёгка умёр»: «...Клікаў смерць, бо хлеба не сталаНЁн прад тым іу споведзі быў; II Уміраў, якзаснуў, ні пікнуў!»* [1, с. 85].

Такім чынам, беднасць і гаротнае жыццё мужыка пераважваюць яго смяротныя грахі і вызваляюць з-пад улады пекла. Таму *«мужыцкі ж валочыцца той дух»* і *«не мае прытулку нігдзе»,* у той час, як *«пан*

*ідзеўшчот у пекле за двух».* Не застаюцца таксама без пакарання і чорт са смерцю, што ўпусцілі на волю грэшную душу. Прычым іх «страшныя» пякельныя пакаранні з'яўляюцца па сутнасці звыклымі для мужыка, які часта сустракаецца з імі ў паўсядзённым зямным жыцці: чорт *«пякельным чартоўскім еудом»* быў *«сасланы ўрыштанскіяроты»,* а смерць - «>' *халоднай сядзела запёрта»* [ 1, с. 85].

Аднак самае разгорнутае ўвасабленне ідэя «мужыцкага выкуплення» знайшла ў адным з найбольш шчымлівых і паэтычных твораў беларускай паэзіі - «Баладзе» Ф. Багушэвіча. У аснове сюжэта твора ляжыць апавяданне пра самотнае жыццё мужыцкага Іова - Ануфрыя Скірдзеля, які *«калісьці разумны быў і заможны».* Аўтар добрасумленна пералічвае досыць нешматлікія адзнакі мужыцкай заможнасці, на якой і грунтавалася сціплае мужыцкае шчасце: *«...Яго дea кублы, жаночыя куфры //Поўныя былі, - там скарб быў рожны: //Старыя спанцэркі, жупан гранатовы, // Палотны, сукны, шапкі, спадніцы. .. //Дзве пары коні, а свіран новы //Ламаўся ад жыта, гароху, пшаніцы // Быў працавіты Ануфры Скірдзель, Н Жонка была і дзетак кучка».* Аднак нечакана селяніна напаткала гора - *«усе прымерлі ў восем нядзель»* і *«застаўся Ануфры, як пучка».* Прычым разам з сям'ёй селяніна заняпала і яго гаспадарка, у якой *«страта на страце»: «Зараза на быдла, пажар і злодзей... // Скаціна пала, гумно згарэла, // Коні пакраліў час рабочы»* [1, с. 80].

Паэт не тлумачыць прычыну трагедыі Ануфрыя Скірдзеля - яна абсалютна нематываваная. Тым не . менш яе вытокі становяцца зразумелымі ў кантэксце старазапаветнай «Кнігі Іова», герой якой *«быў чалавеку зямлі Уц, імя ягонае Ёў; і быў чалавек гэты беззаганны, справядлівы і богабаязны іўхіляўся ад зла. І нарадзілася ў яго сем сыноў і тры дачкі. Маёмасці ў яго было: сем тысяч дробнага быдла, тры тысячы вярблюдаў, пяцьсот пар валоў і пяцьсот асьліц і даволімнога прыслугі...»* (Кніга Ёва 1, 1 - 3). Ён вызначаўся пабожнасцю і беззаганнасцю ў паводзінах, чым дасягнуў прыязнасць Бога. Але аднойчы *«сатана Госпаду <...> сказаў: хіба задарма богабаязны Ёў? ці ня Ты вакол асланіўяго і домягоны іўсё, што ў яго? Дзеі рук ягоных Ты дабраславіў, і статкі ягоныя шырацца па зямлі; але працягні руку Тваю і дакраніся да ўсяго, што ў яго, - ці дабраславіць ён Цябе?» Тў адказ «сказаў Гасподзь сатане: вось, усё, што ў яго, у руцэ тваёй; толькі на самога не прасьцірай рукі тваёй. 1 адышоў сатана ад аблічча Госпадняга»* (Кніга Ёва 1 , 9 - 12). Такім чынам патрапіў Іоў падуладу д'ябла, і багацце яго развеялася ад мяча ворагаў, і ад ветра пустыні *«дом упаў на хлопчыкаў»* яго, *«і яны памерлі»* (Кніга Ёва 1, 19). Але застаўшыся адзін, у жабрацтве і хваробе, тым не менш, *«не зграшыў Ёў і не вымавіў нічога неразумнага пра Бога»* (Кніга Ёва 1, 22), за што Гасподзь узнагародзіў праведніка да схілу доўгіх дзён яго: *«І дабраславіў Бог апошнія дні Ёва болей, чым ранейшыя: <...> І памёр Ёўу старасьці насычаны днямі»* (Кніга Ёва 42, 12 - 17). Адваротным чынам па волі аўтара пассупае ў роспачы Ануфры Скірдзель, які не ў стане заплаціць у казну *«падаткі і збор»: «Ануфры з жалю расхлістаў грудзі, // Зняў крыжык, скінуў шкаплеры. // «Глядзіце, - кажа, - добрыя людзі, //Вот скарб мой - знак маёй веры, - // Хіба што д 'яблу прадам сваю душу, ІІ Каб грошы ён на падаткі мне даў, Н Як тут ужо згінуў і там згінуць мушу, // Бо ужо чорту і душу прадаў!...»* [1, с. 80 - 81]. Але на атрыманыя ад д'ябла грошы Ануфры не толькі *«ўсе падаткі як раз адлічыў»* і *«наеўся смагла»,* іх ён *«на мшу даець», «пазыча, даруе, гдзе трэба - паможа».* Ды й самога ашуканага ў сваіх звыклых памкненнях чорта, што, гледзячы на ўсё гэта *«кіпіць, аж скрыгоча», «свянцонай вадой кожны раз абальець»* [1, с. 81]. І ў гэтых абставінах злому духу « *ў запечку»* застаецца толькі чакаць смерці Ануфрыя, каб завалодаць яго душой. Але і за смяротнай мяжой Ануфры, паеўшы перад смерцю *«поснай заціркі»,* здолеў вырвацца з-пад чортавай улады: *«Ануфры чытае жывоты святых... // Поснай заціркі на палудзень з'еў, // Пеpажагнаўся, задыхаў і сціх!.. // І чорт не паспеў агляну́цца, // Як дух той праз дзверы шмыгнуў, // Сеў на касцёле і грае на дудцы! // А чорт на касцёл не сягнуў!»* [1, с. 81].

Ф. Багушэвіч, ведучы своеасаблівы дыялог з біблейскай «Кнігай Іова», пачынае выступаць апалагетам ідэі сацыяльнай выключнасці «працоўнага чалавека», цяжкая доля якога «выкупляе» любы яго грэх і вызваляе яго ад любой маральнай адказнасці. Паказальна, што ў «Баладзе» гэтую ідэю ўвасабляе «звонавы мярцвяк»: душа Ануфрыя, што жыве на касцёльнай званніцы, звонам адганяе ад сябе чорта, які *«на чатах здалёку стырчыць»* [1, с. 82], ад якога яна здолела такім чынам ўратавацца. Разам з тым, адвечная народная свядомасць не лічыла такую долю «ўратаваннем», бо *«колокольный ман»* [4, с. 259], *«звонавыя мерцвякі» - «гэта, памёрлыя ў грахах нячыстыя людзі, якіх маці-сыра зямля не прымае. Звонавы мярцвяк звычайна з ведзьмакоў, жыве на званніцах»* [6, с. 60], «у *Вялікі чацвер яны грызуць на званніцах званы, каб прыдатней псаваць людзей»* [6, с. 302].

Такім чынам, галоўная спакуса д'ябла - абсалютная свабода ад маральных норм, што з'яўляліся падмуркам патрыярхальнага жыцця пабожнага чалавека любога сацыяльнага стану. Д'ябал усепрысутны і ўсепранікальны. Няма аніякай сферы сацыяльнага жыцця, дзе б ён не меў сваіх інтарэсаў і мэт. Гэтую ўсепранікліваcць адпаведным чынам увасобіў Я. Баршчэўскі ў апавяданні «Белая Сарока»: *«Я днём адпачываю, а пасля заходу сонца блукаю па свеце і выведваю, пра што людзі думаюць, пра што гаво-*

*рацъ, што ядуць і п'юцъ. Ведаю сакрэт, як наслаць моцны сон на сабак і варту; слухаю, пра што гаворыцъ прасталюдзін і выведваю думкі паноў; маё вока хуткае, а слых тонкі, што за сцяною (няхай гэта будуць найтаўсцейшыя муры) магу чуць шэпт; па рысах твару пазнаю характары людзей, змушаю іх гаварыць паміж сабою і памятаю пра ўсё; заходжу праз маленькую шчылінку, і дзверы не скрыпяць, калія іх адчыняю»* [2, с. 206].

Галоўным апірышчам патрыярхальнасці традыцыйна лічылася царква. Таму менавіта супраць царквы ў першую чаргу звяртае д’ябал свае зламысныя высілкі. Так, злы дух, што ўсяліўся ў цела вучня Гугона з апавядання Яна Баршчэўскага «Твардоўскі і вучань», перш за ўсё імкнецца выказаць непавагу да самой рэлігіі, яе абраднасці і яе святароў, бо *«на імшы паводзіў сябе нясціпла, смяшыў іншых, а калі ксёндз падносіў святое прычасце, дык ён не мог вытрываць і выбягаў з касцёла, прыкладаючы хусцінку да носа, нібыта спыняючы кроў».* Акрамя таго *«ён заўсёды быў вялікі непрыяцель усім езуітам, на ксяндзоў пісаў пасквілі, выступаў супраць святое рэлігіі, усім паказваў паганы прыклад, хто толькі з ім пачынаўразмову;* <... >» [2, с. 204]. Надзённасць і балючасць гэтых праяў д’ябальшчыны для тагачаснага грамадскага жыцця відавочная, бо гэтая ж праблема канстатуецца ў напісаных Я. Чачотам (1821) праграмных дакументах Таварыства філаматаў: *«Рэлігіі і маралі варожыя: абыякавасць да ўшанавання бога, непавага да месцаў гэтага ўшанавання, распаўсюджванне поглядаў, якія падрываюць асновы рэлігіі, распуста і адступленне ад звычаяў, усялякагароду празмернасці»* [ 12, с. 162].

Асуджэнне дараванай д’яблам распусты і празмернасцей як увасаблення адрыву і вызвалення ад патрыярхальных маральных норм знаходзіць сваё месца ў апавяданні Я. Баршчэўскага «Вогненныя духі». Герой апавядання, Альберт, дзеля кахання Мальвіны прадае сваю душу д’яблу. Але д’яблавым дарункам з’яўляецца не каханне, а распуста ў якой паступова грэзне Альберт: «У *багатым Альбертавым доме штодня поўна бязбожнае і распуснае моладзі; ён сам усё больш і больш быў нястрыманы ў непрыстойных жадунках і ўчынках; лічыў лухтою любоў да бліжняга, зводзіў і ганьбіў жанчын і дзяўчат рознага саслоўя. Не пераводзілася золата, а перад золатам усё цьмее, і гэта яму было даспадобы»* [2, с. 191]. У самім прадмеце свайго былога кахання ён ужо *«ўбачыў тысячы заган і не хацеў яе больш бачыцъ»* [2, с. 192], а сам увогуле становіцца «жывым мерцвяком», няздатным да сапраўднага жыцця: *«Я пагарджаю ўсім, я хачу здранцвець, быць абыякавым, як труп, халодным, як ледзяная брыла»* [2, с. 192]. Тым самым Альберта напаткаў той лёс, які прарочылі прыхільнікам распусты яшчэ філаматы, занепакоеныя маральным станам сучаснага ім грамадства: *«Маральная распушчанасць, празмернасці і раскоша ў задавальненні жыццёвых патрэб, што прыводзяць да жудасных вынікаў, нараджаюць агіду да шлюбу, якая вельмі часта назіраецца сёння. Праз гэта псуюцца дарэшты не толькі пачцівасць, мараль, не толькі церпіць увесь люд, які ўсё больш прыкметна робіцца слабейшым, бяднейшым, становіцца няздатным як трэба працаваць для дабра краю, а значыць, і для дабра кожнага паасобку»* [2, с. 162]. Тым самым у мастацкай рэчаіснасці Я. Баршчэўскага ў постаці д’ябла актуалізуюцца найбольш надзённыя сацыяльныя праблемы яго часу, якія тады знаходзілі і цалкам рэалістычнае асэнсаванне сацыялагічнага кшталту.

Адной з найбольш яскравых праяў Альбертавай распусты з’яўляецца п’янства, бо *«ў яго доме непрыстойныя забавы, размовы і віно, што пілі без меры, нішчылі маральныя і цялесныя сілы ўсіх тых, хто збіраўся там бавіць часу ганебных уцехах»* [2, с. 190]. 1 менавіта д’ябал схіляе людзей да *«п 'янства і зухаватасці бязбожнай»* («Зухаватыя ўчынкі») [2, с. 121]. Гэтая сацыяльная праблема знаходзіць шырокае адлюстраванне ў мастацкай літаратуры XIX ст., перш за ўсё ў беларускамоўных вершах Я. Чачота, але мастацкая дэманізацыя гэтай з’явы характэрна для паэмы К. Вераніцына «Два д’яблы». Паводле аўтарскага меркавання, п’янства - д’ябальская спакуса, якая вядзе да больш сур’ёзных злачынстваў, такіх, як *«разбой»,* калі *«галышнікі»* адзін аднаго *«ў паўдні, сярод дарогі», «рэжуць, топяць у Дзвіне»* [3, с. 355], *«няма грошай - дыкукрадуць»* ці, *«абграбіўшы заб’юць»* [3, с. 357]. І гэта выклікае непадробную радасць злога духа: *«Тыц к яму з бясоўскай радай: Н Чуць паслухаў - / ' капут. Ч То абкрадзе, то загубіць, Ч Іншы цэркву абкрадзецъ, Ч А хто й сам сябе пагубіць - Ч Люба-радасна глядзецъ/»* [3, с. 356 - 357]. Прычым, К. Вераніцын падкрэслівае, што спойванне мужыкоў - мэтаскіраваная палітыка расійскіх улад. Менавіта яны, карыстаючыся дзяржаўнай манаполіяй на гандаль алкаголем, робяць д’ябальскую справу, спакушаючы сялян п’яным *«раздоллем»* таннай гарэлкі, *«кварта»* якой *«стоіць цяпер злоты»,* таму *«з панядзелка да суботы» «ад дзяшовай будзеш п 'ян».* І гэта сапраўды д’ябальская спакуса: *«Хто гарэлкі перш у губу Ч Адрадзясь яшчэ не браў - Ч Той сцябаў цяпер, аж люба: ЧПа паўгарца іншы жраў»* [3, с. 360]. Таму ў задаволенага чорта няма аніякіх сумненняў, што дзякуючы «шчодраму» царскаму ўраду *«будзе поўна пекла наша», «будземне і пеклу чэсць»* [3, с. 355].

Гапоўны вораг д’ябла - старыя патрыярхальныя цноты сялян і шляхты, калі *«продкі не зайздросцічі багатырам, што жылі недзе там, у далёкіх краях»,* калі *«яны мелі ежу і вопратку са свае працы, а цяпер хцівасць прывяла злых духаў, каб здабывалі грошы з-пад зямлі, а таму* [насталі. - *С. Д.] смутныя*

*гады і смутнае жыццё»* («Рада») [2, с. 252]. Такім чынам, менавіта *«хцівасць»* прывяла д'яблаў з *«далёкіх краёў')>,* дзе зайздросным раскошным жыццём жывуць *«багатыры»,* і гэтыя *«злыя духі»* мусяць здабываць грошы *«з-пад зямлі».* Падобным чынам Я. Баршчэўскі імкнецца ўвасобіць сутыкненне маральных каштоўнасцей дзвюх цывілізацый: патрыярхальнай маралі клерыкальна-аграрнай шляхецкай рэспублікі, якой з'яўлялася колішняя Рэч Паспалітая, і новай капіталістычнай маралі першых зародкаў індустрыяльнай цывілізацыі, што нараджалася на абшарах астатняй Еўропы XVIII - XIX стст. Рэч Паспалітая, рэлікт старога аджылага свету рыцарскіх цнот і патрыярхальнага сялянства, не вытрымала гістарычнага спаборніцтва са спараджэннямі новага свету машыннай вытворчасці і грашовай выгады, і яе інтэлектуальная эліта балюча перажывала гэты цывілізацыйны канфлікт. Таму *«д'яблы»,* што *«размножыліся ў нашым краі»* праз *«глупства шляхты, хцівасць і нязгоду паноў»* («Вечар перад новым годам») [2, с. 219], - гэта перш за ўсё персаніфікацыі паступовай капіталізацыі жыцця, персаніфікацыі прыўнясення сацыяльна-эканамічных навацый індустрыяльнага грамадства, што павольна, але няўмольна закладвапа свае новыя падмуркі на маляўнічых і рамантычных руінах старасвецкай шляхецкай Аркадыі. Менавіта таму пан Генрык з апавядання «Валасы, якія крычаць на гапаве» па намове д'ябла кладзе ў падмурак свайго новага дома цэглу з разбуранай ім могілкавай капліцкі, а на месцы былых могілак з драўлянымі крыжамі сее авёс: *«каб і знаку не было, што тут гніюць нечыя косці»,* бо гэта псуе выгляд з акна і прыводзіць *«да самотных думак і меланхоліі»,* чужасных маладому аптымізму і прадпрымальнай энергіі новай капіталістычнай маралі [2, с. 229 - 230]. Тым самым зямля з дараванага за рыцарскія цно гы продкаў радавога прытулку для старасвецкай шляхты і з адвечнай маці-карміцелькі для сялян раптоўна ператварылася ў тавар, які павінен прыносіць прыбытак і выгоду. Таму свядомая і паслядоўная дэманізацыя матэрыяльнай выгоды стапа адной з родавых рыс тых ідэйна-палітычных плыней, што паўсталі ў якасці інтэлектуальнай рэакцыі на новую капіталістычную мараль, - шляхецкая паводле сваёй генэзы ідэалогія неасарматызму і сялянская ідэалогія беларускага нацыянальнага адраджэння.

Я. Баршчэўскі як яскравы прадстаўнік неасармацкай плыні ў літаратуры польска-беларускага рамантызму надзвычай акрэслена ўвасобіў гэтую тэндэнцыю, бо адна з галоўных місій д'ябла ў яго творы - рацыяналістычнае пераўладкаванне патрыярхальных асноў жыцця, *«забабонаў і людскіх выдумак»* [2, с. 225], дзеля набыцця матэрыяльнай выгоды. Неразуменне і непрыняцце, якое сустракае д'ябал на сваім шляху якраз падкрэслівае гэта: «<...> *яны не разумелі ні мяне, ні свае выгады. Я абышоў цэлы свет, ведаю ўсе чалавечыя пртрэбы, дазнаўся пра самыя пакрыёмыя таямніцы прыроды, хацеў прынесці палёгку жыхарам гэтае неўраджайнае і ўбогае краіны, але яны замест узнагароды засыпалі мяне праклёнамі, нідзе не даючы мне прытулку»* («Валасы, якія крычаць на галаве») [2, с. 225].

Капіталізацыя жыцця з'яўлялася ў гістарычным плане з'явай абсалютна заканамернай, і як кожная жывая з'ява, мела свае выдаткі і недахопы. 1 пісьменнік надзвычай дакладна вызначае найбольш яскравыя адмоўныя праявы «дзікага» капіталізму: крайні індывідуалізм і культ спажывы. Таму *«не спіць злы дух, усюды шкодзіць людзям»,* але асабліва *«сябруе з тымі, хто забывае пра бліжніх сваіх. То кара Божая»* [2, с. 263]. Таму некаторыя паны кшталту *«пана* 1» па парадзе д'ябла збіраюць грошы, прадаючы моладзь у *«далёкія краі»* [2, с. 260] дзеля таго, каб весці шыкоўнае жыццё, якім іх спакушае д'ябал, што *«хваліў ягоныя* [пана. - *С. Д. \ учынкі, маўляў, ён бавіцца і весяліцца, як і належыць сапраўднаму пану - нашчадку знакамітых продкаў, абяцаў паказаць яму нейкія дзівы і адкрыць таямніцу бяздоннага багацця , апавядаў пра цуды, што дзеюцца дзесьці на краі свету; кпіў з нашых звычаяў і завядзёнак, якія нам дасталіся ад продкаў»* («Стогадовы стары і чорны госць») [2, с. 259].

Супрацьстаяць намаганням д'ябла *«ксяндзы», «добрыя людзі»* («Рыбак Родзька») [2, с. 152], *«пачцівыя людзі»* («Вогненныя духі») [2, с. 191], але вызначальную ролю ў гэтым змаганні *Я.* Баршчэўскі адводзіць іезуітам, бо *«езуіты не таму нас вучаць, каб мы выклікалі злых духаў на дапамогу; хто працуе, таму і Бог дапамагае» [2,* с. 145], а *«д'ябал ад крыжа імалітвы ўцякае»* («Рыбак Родзька») [2, с. 152]. Згадка пра езуітаў у творы далёка не выпадковая, бо аўтар сам з'яўляўся іх гадаванцам, але галоўнае - менавіта іезуіты з'яўляліся ідэйным і арганізацыйным авангардам клерыкальнага феадалізму ў зацятай барацьбе з капіталістычнымі праявамі жыцця. Ва ўмовах аграрнага хрысціянскага грамадства яны выконвалі тую ролю, якую ў грамадстве індустрыяльным, капіталістычным, пачынаюць выконваць палітычныя партыі. Таму не выклікае аніякага здзіўлення досыць іранічнае стаўленне Я. Баршчэўскага да сістэмы палітычнай улады новага часу. *«Спрэчкі французскае палаты», «англійскі парламент»* разам з іншымі грамадска-палітычнымі і тэхнічнымі навацыямі *(«чыгунка», «дзівосная вынаходка Дагера»)* мізарнеюць на велічным тле патрыярхальных краявідаў, дзе *«чарнеюць бедныя сялянскія хаціны»,* і бяздоннага неба над галавой, дзе *«мільёнамі зіхоткіх угары зорак напісана Божая ўсемагутнасць»* («Нарыс паўночнае Беларусі») [2, с. 83].

Рацыяналістычны цынізм капіталістычнага ладу жыцця, ~ культ працоўнай нажывы, актуальнай толькі для «гэтага», «зямнога» свету, непазбежна прыводзіў да страты эсхаталагічнай напружанасці

еўрапейскага грамадства, якую часта з часоў Сярэднявечча ў сваіх мэтах эксплуатавала царква. І ў гэтых адносінах сапраўды *«капіталізм аказаўся эфектыўным сродкам супраць Канца Свету»* [13, с. 22]. Таму натуральна, што ідэальным прадвеснікам падобнага роду ідэй для многіх пісьменнікаў уяўляўся адвечны цынік і рацыяналіст д'ябал. І найлепшым чынам гэты канфлікт паміж рамантычна-дыдактычным пафасам сакральнай гісторыі і халоднай «д'ябальскай» прагматычнасцю капіталізму ўвасобіў А. Гарун у апавяданні «У Панасавым сяле» (1920). Так, д'ябал, даведаўшыся ад свайго суразмоўцы, што *«.на носе канец свету»,* рашуча абвяргае песімістычны прагноз, прадпісаны адвечным Наканаваннем Божым: *«Глупства! Глупства! - запярэчыў ён двойчы, зрабіўшы строгую міну. - Проста, пане, некаторым амерыканцам удалося на вайне добра зарабіць, дык на канцы свету хочуць яшчэ лепей паправіцца. От і ўсё!».* 1 далей дух непакоры з прыналежным яму рацыяналізмам адкрывае фінансавую сутнасць эсхаталагічнай афёры з аббурэннем фінансавых рынкаў: *«Ды вельмі проста: паглядзеце, што цяпер на біржах робіцца. Паперы, пане мой, цяпер папраўдзе паперамі сталіся, бо ўсякую вартасць згубілі, а чаму? Таму, што тысячы легкаверных, пачуўшы аб канцы свету, кінуліся ліквідаваць сваё менне. Гэ-гэ! Ліквідацыя! Добрая выдумка! У Амерыцы гэтымі днямі ўжо трэцяя «Кампанія ліквідацыі» залажылася, іўсе добра зарабляюць»* [5, с. 260].

Такім чынам, у творах беларускай літаратуры XIX - пачатку XX стст. д'ябал як сацыяльны персанаж перш за ўсё ўвасабляе маральныя каштоўнасці індустрыяльнага грамадства, варожыя і непрымальныя для патрыярхальнай маралі клерыкальна-аграрнага соцыума, якім з'яўлялася колішняя Рэч Паспалітая і якім пакуль яшчэ працягвала заставацца Расійская імперыя.

## ЛІТАРАТУРА


1. Багушэвіч Ф. Творы: Вершы, паэма, апавяданні, артыкулы, лісты. - Мн.: Маст. літ., 1991.
2. Баршчэўскі Я. Выбраныя творы. - Мн.: Беларускі кнігазбор, 1998.
3. Вераніцын К. Два д'яблы // Літаратура Беларусі: Першая палова XIX ст.: Хрэстаматыя. - Мн.: Беларуская навука, 2000. - С. 355 - 361.
4. Власова М. Русские суеверия: Энциклопедический словарь. - СПб.: Азбука-классика, 2001.
5. Гарун А. Выбраныя творы. - Мн.: Беларускі кнігазбор, 2003.
6. Зеленин Д.К. Избранные труды. Очерки русской мифологии: Умершне неестественной смертью и русалки. - М.: Индрик, 1995.
7. Караткевіч У. Збор твораў: У 8-мі т. - Мн.: Маст. літ., 1990. Т. 7: Дзікае паляванне караля Стаха; Чорны замак Альшанскі.
8. Караткевіч У. Творы: Проза, драматургія, публіцыстыка. - Мн.: Маст. літ., 1996.
9. Купала Я. Поўны збор твораў: У 9-ці т.- Мн.: Маст. літ., 1996. Т. 2: Вершы, пераклады 1908 - 1910.
10. Рассел Д.Б. Люцнфер. Дьявол в Среднне века, - СПб.: Евразня, 2001.
11. Сваяк Казімір (Стаповіч Канстанцін). Мая ліра. Вершы. - Мн.: Маст. літ., 1993.
12. Чачот Я. Наваградскі замак: Творы. - Мн.: Мастацкая літаратура, 1989.
13. Эткинд А. Хлыст (Секты, литература и революция) - М.: Новое литературное обозрение, 1998.
14. \Уа́зко А. Котапіусгпу загтаіугт. Тгас1ус]а з/ІасЬеска \\' ІкегаШгге роізкіе] Іаі 1831 - 1863. - Кгакомс ' ARCANA, 2001.
15. Zȧn T. Twardowski // Zan T. Ballady. - Warszawa: Uniẘesytet Warszawski, 1931. - S. 29 - 41.